# РЭВІТАЛІЗАЦЫЯ ДУХОЎНАЙ СКАРБНІЦЫ ТЫШКЕВІЧАЎ



«Усё ў жыцці чалавека мае пачатак і канец». З дадзеным выказваннем геніяльнага антычнага філосафа Арыстоцеля можна пагадзіцца, калі справа ідзе аб неарганічных і арганічных відах прыроды. Ён лічыў, што пачаткам усяго існага з’яўляецца «насенне», затым «капля вады», «узыходжанне», «развіццё» і заканчваецца «пладанашэннем». Што тычыцца антрапалагічнага віду homo sapiensa, то жыццё яго працягваецца і пасля адыходжання ў іншы свет. Псіхіка чалавека мае такую выключную ўласцівасць, як *памяць*, якая ўяўляе сабой вынік гістарычнага развіцця чалавецтва. Грамадска-гістарычныя з’явы не толькі ўносяць у псіхічны свет чалавека новы змест, але і пераводзяць у свядомасць, а значыцца, і працэсы памяці на якасна іншыя ўзроўні. Па меры станаўлення і развіцця чалавечага грамадства паступова сфарміравалася некалькі форм гістарычнай памяці: рэпрадуктыўная, рэканструктыўная і канструктыўная. Усе абазначаныя формы памяці захоўваюцца і ў сучаснай грамадскай і індывідуальнай свядомасці субъектаў культуры.

Па меркаванні шэрага такіх замежных культуролагаў, як Т. Адорна, Я. Асман, П. Бёрк, гістарычная памяць уключае ў сябе не толькі свядомае, але і сацыяльнае несвядомае (этнічную псіхалогію, архетыпы, сацыяльныя інстынкты) і культурную спадчыну, якая падраздзяляецца на неапрадмечаную (духоўную спадчыну) і апрадмечаную частку (матэрыяльную культуру). Тэхналагічныя і функцыянальныя сэнсы артэфактаў, каштоўнасныя параджаючыя мадэлі культуры – усе яны па

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

сутнасці сваёй, па анталагічным статусе ўяўляюць сабой формы памяці.

Да асноўных носьбітаў гістарычнай памяці, па першае, адносіцца свядомасць людзей, г. зн. памяць аб сацыяльных дзеяннях саміх удзельнікаў падзей, па другое, адасобленыя ад свядомасці, апрадмечаныя крыніцы знакавай інфармацыі і сродкі яе перадачы, спецыяльна створаныя ў гэтых мэтах (архівы, бібліятэкі, музеі, СМІ і інш.), па трэцяе, рэчавыя аб’екты, якія наогул не прызначаны для перадачы інфармацыі (прылады працы ў шырокім сэнсе слова). Дарэчы, што тычыцца апрадмечаных крыніц і рэчавых аб’ектаў як носьбітаў сацыяльнай памяці, расійскі філосаф М. Ф. Фёдараў лічыў, што іх функцыя заключаецца не ў назапашванні мёртвых рэчаў, а ў вяртанні жыцця мінулага, у аднаўленні зышоўшых у небыццё суб’ектаў культуры, па іх артэфактах, жывымі дзеячамі. Нашы папярэднікі пакінулі нам найбагацейшую скарбніцу артэфактаў матэрыяльнай і духоўнай культуры, якія абавязаны не толькі засвоіць сучаснае пакаленне беларусаў, але і данесці да нашчадкаў. У сувязі з гэтым у Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў вядзецца мэтанакіраваная навукова-даследчая дзейнасць па выяўленні, сістэматызацыі і рэвіталізацыі культурна-гістарычнай спадчыны славутых беларускіх дзеячаў навукі і мастацтва.

Так, на працягу пятнаццаці гадоў навукоўцы кафедры культуралогіі даследуюць шматвектарную духоўную дзейнасць прадстаўнікоў графскага роду Тышкевічаў. Пій Фларыянавіч, Канстанцін Піевіч і Яўстафій Піевіч стаялі ў вытокаў айчыннай археалогіі, музеязнаўства, фалькларыстыкі і адукацыі. Яны ўнеслі значны ўнёсак у развіццё паўсядзённай культуры такіх беларускіх гарадоў, як Барысаў, Валожын, Лагойск, Свіслач, шэрага мястэчак і вёсак. На культурнае жыццё Біржы, Крэцінгі, Палангі, Раўдондварыса і іншых былых мястэчак суседняй Літвы адчуваўся таксама ўплыў вядомых прадстаўнікоў роду Тышкевічаў. На алімпе сучаснага сусветнага мастацтва зіхацяць зоркі славутай кінаактрысы Беаты Тышкевіч і кампазітара Яна Тышкевіча.

Духоўная спадчына азначаных і іншых прадстаўнікоў роду Тышкевічаў усебакова даследавана і рэпрезентавана сучаснікам Беларусі і замежжа праз публікацыі ў навуковых зборніках

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

традыцыйных канферэнцый, якія кожныя два гады ладзяцца кафедрай культуралогіі ў гарадах і мястэчках Беларусі, якія некалі належалі роду Тышкевічаў.

Сёлятнія IX Тышкевіцкія чытанні праводзяцца ў Валожыне, непадалёку ад якога ў Вялым у XIX ст. Бенедыкт Тышкевіч стварыў фатаграфічную майстэрню і тым самым садзейнічаў развіццю візуальнага мастацтва ў Беларусі. Прыемна адзначыць, што ў азначаных чытаннях прымаюць удзел не толькі навукоўцы ўніверсітэта, але краязнаўцы Барысава, Валожына, Вілейкі, Лагойска, якія шмат робяць для ўзнаўлення гістарычнай памяці славутасцей Беларусі. Жадаю IX Тышкевіцкім чытанням плёну, цікавых дыскусій і адкрыццяў новых аспектаў культуратворчай дзейнасці прадстаўнікоў роду Тышкевічаў!

*Н. У. Карчэўская, рэктар*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта*
*культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ